Гістарыяграфія

Сяргей НОВІКАЎ

# Дзесяцігадовы ўклад у ваенна-гістарычную навуку Беларусі



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч загадчык кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры МДЛУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага р-на Мінскай вобл., у 1980 г. закончыў МДПІ імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). Адзін з аўтараў-складальнікаў і перакладчыкаў кнігі "Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа "Белоруссия" (Минск, 8—10 апреля 1943 года)" (Мн., 2006). Сааўтар вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў, навуковых выданняў "Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945" (Мн., 2005), "Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941—1945 гг." (Мн., 2010). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—9 (Мн., 2002—2010).*

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце 7 красавіка 2011 г. адбылася 10-я міжнародная навуковая канферэнцыя **"Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць"**. Пачатак жа традыцыі правядзення канферэнцый "Беларусь і Германія" быў пакладзены рэспубліканскай канферэнцыяй 23 мая 2002 г., прысвечанай 10-годдзю ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Федэратыўнай Рэспублікай Германія. У тым жа годзе быў выдадзены і першы зборнік з 25 матэрыяламі ўдзельнікаў канферэнцыі. У рэдакцыйную калегію ў гэты і наступныя гады ўваходзілі дактары гістарычных навук А.В.Шаркоў (Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь), У.К.Коршук, У.Ф.Ладысеў, У.Е.Снапкоўскі, В.Г.Шадурскі, А.В.Шарапа (БДУ), Э.Р.Іофе, А.А.Каваленя (БДПУ), У.І.Лемяшонак (БДУІР), А.М.Літвін (Інстытут гісторыі НАН Беларусі), кандыдат гістарычных навук С.Я.Новікаў (МДЛУ). Першы зборнік выйшаў пад рэдакцыяй прафесара У.Ф.Ладысева, наступныя — прафесара А.А.Кавалені. Значную ролю ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення канферэнцыі адыграла супрацоўніцтва Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта з аддзелам ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі (загадчык — доктар гістарычных навук прафесар А.М.Літвін).

У дзевяці зборніках матэрыялаў канферэнцый, якія складаюць значную гістарыяграфічную з'яву ў сучаснай беларускай ваенна-гістарычнай навуцы, апублікавана больш за 400 дакладаў, выступленняў і паведамленняў даследчыкаў з 8 краін — Беларусі, Аўстрыі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны. Удзельнікамі канферэнцый з'яўляліся гісторыкі, сацыёлагі, палітолагі, эканамісты, культуролагі, мастацтвазнаўцы і іншыя спецыялісты ў галіне беларуска-германскіх адносін. Сярод задач, якія з першай канферэнцыі спрабавалі вырашыць яе ўдзельнікі, асабліва адметнай бачыцца пошук новых навуковых падыходаў да вывучэння ваеннай гісторыі Беларусі і Германіі. Таму невыпадкова, што на працягу гэтых гадоў значная ўвага надавалася даследаванню гісторыі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

У дадзеным артыкуле прапануецца кароткі агляд вынікаў праведзенай працы ў галіне ваеннага беларусазнаўства, дзе айчынныя і замежныя гісторыкі прыўносілі свой уклад у агульную скарбонку сучаснай ваенна-гістарычнай навукі.

Адной з цэнтральных тэм, якая знаходзілася ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў канферэнцый, з'яўлецца ***крыніцазнаўства*** гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Даследчыкі ваеннай гісторыі ішлі ў гэтым напрамку шляхам увядзення ў навуковы зварот но-

вых дакументальных крыніц, а таксама выкарыстання для аналізу фактаў новых метадаў, адпаведных сучаснаму ўзроўню сусветнай ваенна-гістарычнай навукі.

Пачынаючы з першай канферэнцыі цікавыя матэрыялы прадстаўляў *У.І.Лемяшонак*: "Другая сусветная вайна ў Беларусі на старонках гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць", "Штурм Берліна — завяршальны этап Берлінскай аперацыі", "Беларуская наступальная аперацыя ў ацэнцы нямецкіх генералаў і афіцэраў", "Гісторыя германскай акупацыі Беларусі ў адлюстраванні крыніц гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць". Як галоўны рэдактар кніг гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць", агульная колькасць якіх складае 146 тамоў, ён пад рознымі вугламі паказваў Беларусь на старонках выдання, гаварыў аб неабходнасці ўвядзення новых дакументальных крыніц, у тым ліку з нямецкіх архіваў, для далейшага ўсебаковага вывучэння ваеннай гісторыі Беларусі.

*А.А.Каваленя* ў паведамленні "Некаторыя аспекты германскай маладзёжнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў адлюстраванні архіўных дакументаў (1941—1944 гг.)" прыйшоў да высновы, што аб'ектыўнае даследаванне патрабуе выкарыстання як мага большай колькасці арыгінальных архіўных крыніц, у тым ліку нямецкіх, іх крытычнага аналізу і супастаўлення з апублікаванай навуковай і мемуарнай літаратурай. Не менш увагі надавала дакументальнай базе даследаванняў *Г.Д.Кнацько*. У артыкулах "Загадка Аўгусціна, ці Гісторыя адной здрады", "Ведамства паліцыі бяспекі і СД па Беларусі ў Мінску. Новыя факты аб структуры і дзейнасці", "Прычыны і наступствы візітаў Фрыца Заўкеля ў генеральную акругу "Беларусь" (да пытання аб прымусовым вывазе насельніцтва ў Германію)" яна не толькі прывяла арыгінальныя дакументы для доказу сваіх навуковых гіпотэз, але выказала ўпэўненасць, што для ўзнікнення новага погляду на вядомыя гістарычныя падзеі неабходна іх новае прачытанне.

Для матэрыялаў *І.Ю.Варанковай* — "Пісьмы салдатам вермахта. Агляд калекцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны", "Нямецкая абшчына ў акупаваным Мінску (па старонках газеты "Minsker Zeitung" (1942—1944)", "Эвакуацыя дзяцей з Мінска ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны", "Перапыненыя гастролі. Маскоўскі мастацкі тэатр у Мінску ў чэрвені 1941 года", "Да пытання аб прымусовай мабілізацыі працоўнай сілы на акупаванай тэрыторыі Беларусі", "Узнагароды франтавікоў і партызан у зборы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны" — характэрны зварот да дакументальных крыніц з фондаў гэтага музея. На думку даследчыцы, кожны новы дакумент мае асаблівую каштоўнасць тады, калі ўведзены ў навуковы зварот.

*А.В.Шаркоў* выкарыстоўвае ў сваіх даследаваннях малавядомыя дакументальныя матэрыялы з архіва МУС Беларусі. Ім напісаны артыкулы "Аператыўная работа ў лагерах ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі ў 1944—1951 гг.", "Генералы вермахта і карных органаў нацысцкай Германіі ў палоне", "Вестарбайтары" на будоўлях Беларусі 1945—1951", "Мерапрыемствы па прыёму савецкіх грамадзян з тэрыторыі дзяржаў Заходняй Еўропы (1944—1946)", "Ліквідацыя месцаў пазбаўлення свабоды на тэрыторыі Беларусі з пачаткам нямецкай агрэсіі 1941 г.". Даследчык лічыць, што час ставіць перад гісторыкамі новыя праблемы, даследаванне якіх немагчыма без выкарыстання новых дакументальных крыніц. Гэты тэзіс пацвярджае *Я.І.Бараноўскі* ў матэрыялах "Некаторыя пытанні перыядызацыі гісторыі антыфашысцкага гарадскога падполля ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1944)", "Важнейшыя рысы жыцця і паводзін цывільнага насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (па матэрыялах нямецкага трафейнага архіва)", "Жыццё і дзейнасць Баляслава Берута, будучага прэзідэнта Польшчы, у Мінску ў гады Вялікай Айчыннай вайны", "Некаторыя праблемы вывучэння нямецкага архіўнага матэрыялу аб арыштах удзельнікаў антыфашысцкага супраціву ў Мінску (1941—1944 гг.)", "Гісторыя Мінскага антыфашысцкага падполля (1941—1944 гг.): па матэрыялах нямецкага трафейнага архіва і архіўных фондаў ФРГ". Гісторык перакананы, што адметнай рысай сучасных даследаванняў павінна быць шырокае выкарыстанне нямецкіх архіўных дакументаў, без якіх практычна немагчыма адказаць, у прыватнасці, на асобныя пытанні гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля.

Вусная гісторыя і ўспаміны відавочцаў склалі аснову даследаванняў *А.М.Літвіна* аб прымусовай працы беларускіх остарбайтараў: "Прымусовая праца беларускіх грамадзян у святле навуковых фактаў і асабістых успамінаў сведак", "Схаваная памяць: вопыт прымусовай працы беларускіх остарбайтараў (на матэрыяле ўспамінаў і інтэрв'ю)". У апошнім матэрыяле гісторык паказаў, што ўспаміны сведак падзей мінулай вайны з'яўляюцца важнай крыніцай інфармацыі па самых розных аспектах паўсядзённасці, выжывання людзей у экстрэмальных умовах ваеннага часу. Дакументальныя крыніцы былі пакладзены ў аснову артыкулаў *Э.Р.Іофе*, прысвечаных даследаванню гісторыі Халакосту на беларускай зямлі: "Гэта быў Халакост", "Матэрыялы судовага працэсу 1946 г. у Мінску над нямецкімі ваеннымі злачынцамі як крыніца па гісторыі Халакосту на беларускай зямлі", "Барацьба нямецкіх спецслужбаў з Мінскім антыфашысцкім падполлем у 1941—1944 гг.", "Асаблівасці Халакосту на тэрыторыі Беларусі".

Прымусовую працу мясцовага насельніцтва рознабакова даследаваў на аснове вялікага кола дакументальных крыніц *Я.А.Грэбень*. Ён выступаў на канферэнцыях з наступнымі матэрыяламі: "Сістэма рэгістрацыі і ўліку насельніцтва акупаванай Беларусі (1941—1944)", "Вярбоўка насельніцтва генеральнай акругі Беларусі на работы ў Германію (1942—1944 гг.)", "Сацыяльны аспект працоўнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад на акупаванай тэрыторыі Беларусі", "Прымусовая праца ў генеральнай ак-

рузе "Беларусь": агляд крыніц", "Арганізацыя працоўнай павіннасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944 гг.)", "Прымусовая праца грамадзян Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі: вопыт вывучэння праблемы на прыкладзе Мінскай вобласці". Аб важнасці выкарыстання новай базы крыніц выказаўся *А.І.Котаў* у матэрыяле "Крыніцазнаўчая база гісторыі Беларусі перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны (1939—1945 гг.: стан і праблемы)". Ён адзначыў, што крыніцавая база, якая цяпер маецца ў распараджэнні даследчыкаў, гарантуе дастаткова глыбокае вывучэнне праблемы прымусовай працы грамадзян у перыяд нацысцкай акупацыі Беларусі.

*С.П.Кубека* на аснове дакументаў з нацыянальнай калекцыі "Александрыйскія мікрафільмы" даў у сваіх выступленнях ацэнку розным аспектам акупацыйнага рэжыму: "Пачатак Вялікай Айчыннай вайны і Беларусь у адлюстраванні нацыянальнай калекцыі "Александрыйскія мікрафільмы", "Палітыка генацыду і "выпаленай зямлі" на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. (па матэрыялах нацыянальнай калекцыі "Александрыйскіх мікрафільмаў)", "Некаторыя аспекты ваеннай гісторыі Беларусі ў адлюстраванні нацыянальнай калекцыі "Александрыйскія мікрафільмы", "Дакументы нацыянальнай калекцыі "Александрыйскія мікрафільмы" аб савецкіх ваеннапалонных (чэрвень—снежань 1941 г.)". *А.Г.Зельскі* ў публікацыі "Беларусы ў нямецкіх лагерах для ваеннапалонных (на прыкладзе Гомельскай вобласці)" надаў увагу аналізу ўліковых картак як дакументальных крыніц для асвятлення трагічнага лёсу ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі. *С.Я.Новікаў* у публікацыі "Да пытання навуковай распрацоўкі матэрыялаў "Wi Stab Ost" аб германскай ваенна-эканамічнай палітыцы (1941—1944 гг.)" абазначыў неабходнасць пашырыць дакументальную базу даследавання эканамічных аспектаў ваеннай гісторыі Беларусі на аснове выкарыстання дакументаў з нямецкіх архіваў, у прыватнасці фондаў Інстытута найноўшай гісторыі ў Мюнхене і Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу (Германія).

Вялікі інтарэс выклікаюць дакументальныя матэрыялы з абласных архіўных фондаў. Так, *Г.М.Якаўлева* падрыхтавала артыкул "Фонды Віцебскай гарадской управы як крыніца па вывучэнню паўсядзённага жыцця г. Віцебска ў гады нямецкай акупацыі (1941—1944)"; *А.І.Корсак* разгледзела гісторыю ваеннай паўсядзённасці на акупаванай тэрыторыі Віцебшчыны на аснове перыядычных выданняў акупацыйных улад: "Акупацыйны рэжым і Віцебскае гета ў час Вялікай Айчыннай вайны", "Перыядычныя выданні нацысцкіх акупацыйных улад як крыніца гісторыі паўсядзённасці (па матэрыялах фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці)"; *В.М.Матох* прааналізаваў дакументы Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці як крыніцу па гісторыі нямецкага радыёвяшчання і прапаганды сярод насельніцтва. У артыкулах *Л.С.Скрабінай* "Штодзённасць пад акупацыяй (паводле нямецкіх трафейных матэрыялаў)", "Вайна вачыма нямецкага салдата (па пісьмах салдат вермахта)", "Да пытання аб настроі і паводзінах насельніцтва Беларусі ў гады нямецкай акупацыі" зроблены зварот да дакументаў эпісталярнага жанру, які дапамог выявіць малавядомыя аспекты ваеннай паўсядзённасці на Гомельшчыне. Цікавасць уяўляе таксама лінгвістычны падыход, прапанаваны *С.П.Паўлавіцкім* для аналізу дакументаў аб падзеях вайны ў Беларусі ў артыкуле "Аб прымяненні лінгвістычных прыёмаў да аналізу гістарычных дакументаў".

Падсумоўваючы агляд публікацый па крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, неабходна адзначыць, што праца з дакументамі застаецца для беларускіх гісторыкаў адным з галоўных напрамкаў навуковых пошукаў. Даследчыкі ваеннай праблематыкі ідуць правераным шляхам — ад аналізу новых дакументальных крыніц да рэканструкцыі асобных падзей вайны і акупацыі, іх далейшага вывучэння, асвятлення і разумення. Актыўны пошук дадатковых архіўных матэрыялаў і спробы іх новага прачытання сведчаць, што значная частка беларускіх даследчыкаў не вельмі задаволена станам навуковай распрацоўкі асобных пытанняў ваеннай гісторыі Беларусі. Аб'ектыўнае вывучэнне іх яны бачаць у выкарыстанні максімальна поўнага кола розных дакументаў і матэрыялаў, у тым ліку замежнага паходжання. Сёння перад айчыннымі даследчыкамі ваеннай праблематыкі стаіць задача абавязковага выкарыстання замежных дакументальных матэрыялаў і гістарыяграфічных крыніц.

Значная ўвага ў матэрыялах зборнікаў канферэнцый нададзена пытанням ***гістарыяграфіі*** Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, прычым не толькі айчыннай, але і замежнай. Важным укладам у беларускую ваенную гістарыяграфію з'яўляецца публікацыя *А.М.Літвіна* "Сучасная гістарыяграфія ваеннай гісторыі Беларусі перыяду Другой сусветнай вайны: асаблівасці навуковага вывучэння", якая мае важнае метадалагічнае значэнне. Даследчык падзяліў гістарыяграфію гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны на два асноўныя перыяды — савецкі і сучасны, рубяжом паміж якімі вызначаны канец 1991 года. Важнае месца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі займаюць публікацыі *У.В.Здановіча* "Пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі ў адлюстраванні савецкай гістарыяграфіі", "Ідэалагічнае супрацьстаянне на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: гістарыяграфія праблемы", "Партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: колькасныя ацэнкі", "Арганізацыя навуковых даследаванняў па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (другая палова 1940-х — першая палова 1960-х гадоў)", "Вывучэнне гісторыі падполля на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1990—2000-х гадах", "Гісторыя Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў дысертацыйных даследаваннях (другая палова 1990-х—2000-я гг.)". У іх аўтар спрабуе не толькі абагульніць назапашаны шматгадовы даследчыцкі вопыт, але вызначае




*Зборнікі матэрыялаў міжнародных навуковых канферэнцый "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць".*

асноўныя навуковыя тэндэнцыі і прынятыя падыходы да вывучэння. *С.А.Сіткевіч* адзначае важнасць працягу даследавання гісторыі польскага падполля ў сваёй публікацыі "Вывучэнне польскага падполля на тэрыторыі Беларусі (1939—1954 гг.): стан і перспектывы".

Агляду гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі па пытаннях ваеннай гісторыі Беларусі былі прысвечаны матэрыялы *Я.П.Бязлепкіна*: "Аперацыя "Барбароса": навуковыя падыходы амерыканскіх і англійскіх даследчыкаў", "Мясцовая паліцыя на тэрыторыі акупаванай Беларусі 1941—1944 гг.", "Партызанскі рух на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: падыходы замежных даследчыкаў", "Навуковая тэрміналогія англамоўнай гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі па даследаванні савецкага партызанскага руху". Яны яшчэ раз засведчылі неабходнасць шырокага выкарыстання напрацовак замежных гісторыкаў для ўсебаковага вывучэння гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Асобныя аспекты развіцця нямецкай гістарыяграфіі былі прадстаўлены ў артыкулах *У.Я.Калаткова* "Нямецкая гістарыяграфія як крыніца па гісторыі акупацыі Беларусі", "Германская гістарыяграфія грамадска-культурнага жыцця ў акупаванай гітлераўцамі Беларусі: стан вывучэння ў айчыннай гістарычнай літаратуры", "Падрыхтоўка медычных кадраў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1942—1944 гг. у адлюстраванні айчыннай і замежнай гістарыяграфіі", "Нацысцкая акупацыйная палітыка ў сацыяльна-культурнай сферы на тэрыторыі Беларусі: кароткі агляд германскай гістарыяграфіі", "Нацысцкая палітыка і грамадска-культурнае жыццё ў Беларусі пад акупацыяй у гістарыяграфіі ФРГ 1950—80-х гадоў".

Гістарыяграфічны аналіз нацысцкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Віцебшчыны быў зроблены ў публікацыі *Г.М.Якаўлевай* "Нацысцкі акупацыйны рэжым на Віцебшчыне: агляд сучасных даследаванняў". Аб новых гістарыяграфічных ракурсах, звязаных з вывучэннем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, расказала *В.В.Брыгадзіна* ў матэрыялах "Да пытання аб вывучэнні паўсядзённасці гісторыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.)", "Маскоўская бітва ў ацэнках яе ўдзельнікаў: да пытання аб новых ракурсах вывучэння гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў". Даследчыца звярнула ўвагу на сітуацыю, калі на фоне значнага прыросту ведаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прафесійная гістарыяграфія часам не можа прадставіць пераканаўчыя адказы на новыя пытанні пра перадваенныя, ваенныя і пасляваенныя падзеі.

*М.В.Стралец* у сваіх матэрыялах звяртае ўвагу на найноўшыя даследаванні айчынных гісторыкаў. Так, у публікацыі "Сур'ёзны ўклад у даследаванне персаніфікаванага аспекту антыгерманскага супраціву на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг." ён вызначае ўклад аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам прафесара Э.Р.Іофе ў распрацоўку пытанняў складу вышэйшага партыйнага камандавання Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. *Р.К.Паўловіч* у

матэрыяле "Да пытання аб атаясамленні баявой дзейнасці Пінскай і Дняпроўскай рачных ваенных флатылій у гады Вялікай Айчыннай вайны ў савецкай і сучаснай беларускай гістарыяграфіі" спрабуе вызначыць ступені навуковай адэкватнасці адлюстравання баявой дзейнасці гэтых флатылій у савецкай і беларускай гістарыяграфіі. *А.М.Рэзнік* вызначае навуковую абгрунтаванасць працы Р.К.Паўловіча "Рачныя ваенныя флатыліі на тэрыторыі Беларусі (1919—1951 гг.)", дэталёва аналізуе змест манаграфіі і падтрымлівае асноўныя вынікі, прапанаваныя даследчыкам. *С.Р.Лютко* зрабіў агляд ваенных падзей на прыкладзе адной з абласцей БССР — "Мінская вобласць у гады Вялікай Айчыннай вайны: гістарыяграфія".

Гістарыяграфічныя аспекты даследавання германскай эканамічнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. — тэма, якую разглядаў *С.Я.Новікаў* у матэрыялах "Германская эканамічная палітыка ў Беларусі 1941—1944 гг.: гістарыяграфічна-канцэптуальны аспект", "Германскі рэжым на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.: погляд у кантэксце гістарыяграфічнай кампаратывістыкі", "Гістарыяграфічная кампаратывістыка — прыярытэтны напрамак па даследаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны", "Сістэма эксплуатацыі альбо хаос рабавання, ці Да пытання аб германскіх ваенна-эканамічных службах у Беларусі (1941—1944 гг.)", "Некаторыя вынікі даследавання ваенна-эканамічнай гісторыі ўсходніх абласцей Беларусі (1941—1944 гг.)".

Падсумоўваючы гістарыяграфічныя публікацыі беларускіх гісторыкаў, неабходна адзначыць, што перад гісторыкамі па-ранейшаму стаяць задачы па тэарэтычным і метадалагічным асэнсаванні асобных аспектаў гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на аснове адыходу ад стэрэатыпных трактовак савецкай гістарыяграфіі. Але, нягледзячы на вялікую колькасць дакументальных крыніц, апублікаваных за апошні час беларускімі, расійскімі і замежнымі гісторыкамі, сур'ёзная праца з гістарыяграфічнымі крыніцамі толькі пачынаецца. Актуальнымі з'яўляюцца задачы ўніфікацыі навуковай тэрміналогіі і паняційнага апарату ў адпаведнасці з сучаснымі тэндэнцыямі развіцця сусветнай ваенна-гістарычнай навукі. Чакаюць сваіх даследчыкаў і пытанні, якія па сённяшні дзень маюць дыскусійны характар, патрабуюць выкарыстання не толькі адэкватных часу новых даследчыцкіх падыходаў па аналізе розных гістарыяграфічных крыніц, але і пошуку навуковага кампрамісу ў мэтах набліжэння поглядаў айчынных і замежных гісторыкаў па праблемах ваеннай гісторыі.

Калі гаварыць пра тэматычнае напаўненне зборнікаў матэрыялаў канферэнцый, то асноўны акцэнт зроблены на баявую дзейнасць часцей Чырвонай Арміі, партызан, беларускіх падпольшчыкаў, гісторыю ваеннай паўсядзённасці і трагічныя наступствы акупацыйнай палітыкі ў Беларусі ў 1941—1944 гг.

Асобны комплекс складаюць матэрыялы, прысвечаныя розным аспектам узброенай барацьбы на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адным з такіх аспектаў з'яўляюцца ***баявыя дзеянні***. Яны прааналізаваны ў такіх публікацыях як: "Чэрвень 1941 г.: баі на граніцы", "Праз выпрабаванні ў баях мы паскорылі сустрэчу на Эльбе" (*В.І.Курганаў*); "Загінуўшыя і прапаўшыя без вестак на тэрыторыі Беларусі супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі ў перыяд з 22.06 па 07.07.1941 г.", "Прапаўшыя без весткі спецгрупы НКУС-НКДзБ БССР у 1942—1943 гг." (*А.Г.Зельскі*); "Да пытання аб дапамозе мясцовага насельніцтва Заходняй Беларусі Чырвонай Арміі летам 1944 года", "Да пытання аб разгроме савецкімі партызанамі нямецкай рачной ваеннай флатыліі на р. Прыпяць вясной 1943 г.", "Да пытання аб абароне Пінска Пінскай рачной ваеннай флатыліяй у канцы чэрвеня—пачатку ліпеня 1941 г.", "Роля Дняпроўскай флатыліі ў аперацыі "Баграціён" (*Р.К.Паўловіч*); "Авіяцыя як сродак дастаўкі разведвальнай інфармацыі з тэрыторыі Беларусі" (*У.М.Якубоўскі, В.К.Кісялёў*); "Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён", "Штурм Берліна — завяршальны этап Берлінскай стратэгічнай аперацыі" (*У.І.Лемяшонак*); "Праўда і міфы аб разбурэннях у Мінску ў 1941 г. і ў 1944 гг.", "Вызваленне Беларусі 1943—1944 гг." (*У.К.Коршук*); "Баявыя дзеянні 1-й паветранай арміі пры ўступленні савецкіх войскаў на тэрыторыю ўсходняй Прусіі (16—27 кастрычніка 1944 гг.)" (*Д.А.Дзякаў*); "Воіны-беларусы ў баях за Берлін" (*Б.Д.Далгатовіч*); "Вызваленне Беларусі: вопыт узаемадзеяння рэгулярных войск з партызанскімі фарміраваннямі і мясцовым насельніцтвам" (*А.І.Котаў*).

У іншых матэрыялах у фокусе даследчыцкай увагі знаходзіцца дзейнасць беларускіх партызан. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь *М.А.Бандарэнка* выступіў з матэрыяламі "В.З.Корж", дзе паказаў баявыя рэйды партызан на Палессі, "Медыцынская дапамога партызанам і насельніцтву Беларусі ў тыле ворага (1941—1944 гг)". *У.І.Кузьменка* раскрыў новыя бакі інтэлектуальнага супрацьстаяння падчас нацысцкай акупацыі Беларусі ў матэрыялах "Прапагандысцкае забеспячэнне акупацыйнага рэжыму ў Беларусі і асаблівасці культурнай палітыкі нацыстаў (1941—1944 гг)", "Сацыяльныя слаі і групы насельніцтва Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі 1941—1944 гг.: да пастаноўкі пытання", "Журналісты і літаратары БССР у барацьбе з фашызмам (1941—1945 гг.)", "Нацысцкая акупацыя Беларусі і народнае супраціўленне ёй: аспекты інтэлектуальнага процістаяння", "Сацыяльнае манеўраванне германскіх акупацыйных улад у Беларусі (1941—1944 гг.)". Прадметам дэталёвага аналізу *А.Я.Паўлавай* стаў "Камандны склад партызанскіх фарміраванняў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны".

*С.Р.Лютко* прадставіў даследаванні "Эвакуацыя людскіх і матэрыяльных рэсурсаў з тэрыторыі Мінскай вобласці ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны", "Супраціўленне насельніцтва Мінскай вобласці нямецка-фашысцкай акупацыі ў гады Вялікай Айчын-

най вайны"; *З.А.Козел* — "Падрыхтоўка кадраў для партызанскіх фарміраванняў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941—жнівень 1944)", "Мерапрыемствы германскага ваеннага камандавання супраць беларускіх партызан у чэрвені — снежні 1941 г. (па дакументах Беларускага штаба партызанскага руху)", "Арганізацыя радыёсувязі з партызанскімі фарміраваннямі Беларусі (1941—красавік 1943 гг.)".

Стаўленне немцаў да партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі і ўдзел у ім саміх немцаў адлюстравалі *А.І.Котаў* і *С.А.Котава* ў сваіх матэрыялах "Сведчанні афіцыйных асоб рэйха і вермахта аб партызанскім руху ў Беларусі", "Удзел немцаў у партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі (1941—1944 гг.)". *У.В.Тугай* у матэрыяле "Латышы Беларусі ў выпрабаваннях вайны" паказаў удзел латышоў і этнічных немцаў у барацьбе супраць германскіх захопнікаў на беларускай зямлі. Разам з прафесарам *В.М.Фаміным* ён адлюстраваў удзел "Рэйхсдойчэ" у радах беларускіх партызан (1941—1944 гг.)". Тэму "Расследаванне і судовы разгляд злачынстваў у партызанскіх зонах Беларусі (1941—1944 гг.)", прадставілі *А.Ф.Вішнеўскі* і *Ф.А.Шумскі*. *А.В.Радзюк* падрыхтаваў матэрыял "Клічаўская партызанская зона (1941—1944 гг.)".

Такім чынам, працяг даследаванняў баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны сведчыць, з аднаго боку, аб выяўленні навукоўцамі новых аспектаў гэтай праблематыкі, а з другога — аб невычэрпнасці гістарычных фактаў з баявога мінулага беларускіх партызан, маракоў Пінскай рачной ваеннай флатыліі, воінаў Чырвонай Арміі ў ходзе абарончых баёў лета 1941 года і вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нацысцкіх акупантаў у 1943—1944 гг.

У іншых апублікаваных матэрыялах аналізуецца таксама ***дзейнасць беларускіх падпольшчыкаў***. Гэта артыкулы *Я.І.Бараноўскага* "Некаторыя пытанні работы спецыяльнай камісіі па дадатковым вывучэнні асобных пытанняў гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля і ролі ў ім І.К.Кавалёва", "З гісторыі дзейнасці былых савецкіх ваеннапалонных у складзе Мінскага антыфашысцкага падполля"; *М.А.Бандарэнкі* "Яўген Клумаў — герой Мінскага падполля"); *А.В.Загорскага* "Іван Кабушкін — герой Мінскага падполля"); *С.М.Тукалы* "Афармленне падпольнага арганізацыйнага цэнтра ў Мінскім гета (жнівень 1941 г.)"; *Э.Р.Іофе* "Барацьба нямецкіх спецслужбаў з Мінскім антыфашысцкім падполлем у 1941—1944 гг.". Невялікая колькасць матэрыялаў па гісторыі дзейнасці беларускіх падпольшчыкаў не азначае адсутнасці інтарэсу да гэтай важнай гістарычнай праблематыкі. Як паказвае артыкул Я.І. Бараноўскага, толькі шматгадовае вывучэнне спрэчных пытанняў з выкарыстаннем новых дакументаў і дадатковых матэрыялаў па гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля прыводзіць да аб'ектыўных вынікаў і патрабуе пры гэтым усебаковага вывучэння як дакументальных, так гістарыяграфічных крыніц, іх больш смелага навуковага аналізу.

Даволі значнае месца ў выдадзеных зборніках займаюць даследаванні, у якіх гісторыкі паказваюць ***злачынны характар нацысцкага акупацыйнага рэжыму*** і трагічныя наступствы яго дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. Сярод маладаследаваных аспектаў германскай акупацыі ў Беларусі варта адзначыць наступныя: "Савецкія ваеннапалонныя" (*У.К.Коршук*); "Прапагандысцкае забеспячэнне акупацыйнага рэжыму ў Беларусі і асаблівасці культурнай палітыкі нацыстаў у 1941—1944 гг. (*У.І.Кузьменка*); "Нацысцкія планы рабавання сельскай гаспадаркі Беларусі падчас Другой сусветнай вайны", "Інтэнсіфікацыя сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі ў канцы 1941—1942 гг.", "Аналіз распараджэнняў і загадаў нямецкіх акупацыйных уладаў па правядзенні аграрнай рэформы 1942 г. на тэрыторыі Беларусі", "Сельскагаспадарчае падаткаабкладанне на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі падчас Другой сусветнай вайны: этапы, формы, вынікі", "1944 г.: Рабаванне нацыстамі сельскай гаспадаркі заходніх абласцей Беларусі ва ўмовах акупацыі" (*С.Л.Казлова*); "Арганізацыя працоўнай павіннасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944 гг.)", "Сістэма рэгістрацыі і ўліку насельніцтва акупаванай Беларусі (1941—1944 гг.)", "Судовая сістэма на акупаванай тэрыторыі Беларусі 1941—1944 гг. (на прыкладзе суда Зубаўскай воласці Аршанскага раёна)", "Вярбоўка насельніцтва Генеральнай акругі Беларусь на работы ў Германію (1942—1944 гг.), "Дзейнасць вучэбна-вытворчага камбіната ў Мінску ў 1941—1942 гг.", "Сацыяльны аспект працоўнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад у Беларусі 1941—1944 гг." (*Я.А.Грэбень*); "Прымусовая праца мясцовага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг." (*С.Я.Новікаў*); "Новы парадак" і яго прапагандысцкае забеспячэнне ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі БССР 1941—1944 гг." (*В.І.Курганаў*); "Цана вайны. Да пытання аб працоўным выкарыстанні германскіх ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі" (*А.Л.Самовіч*); "Арганізацыя і праца сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", "Сутнасць і змест акупацыйнай сістэмы адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", "Школьна-выдавецкая дзейнасць на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", "Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў, яе мэта і задачы ў ажыццяўленні акупацыйнай палітыкі на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (*М.Г.Жылінскі*).

Такім чынам, пры распрацоўцы праблематыкі, якая тычыцца гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, аўтары не абмінаюць увагай як супярэчлівыя, так і маладаследаваныя пытанні ўздзеяння акупацыйнай улады на беларускае грамадства. У цэнтры ўвагі адразу некалькіх даследчыкаў знаходзіліся эканамічныя аспекты акупацыі, якія складалі

адзін з важных сегментаў цэласнай карціны беларускай ваеннай гісторыі. Аб маштабах удзелу мясцовага насельніцтва ў прымусовай працы чытач добра ведае часцей за ўсё праз факты працы ў рэйху амаль 400 тысяч нашых суайчыннікаў у якасці остарбайтараў, і нават не ўяўляе рэальныя маштабы прыцягнення беларускіх грамадзян, асабліва жанчын, да прымусовай працы — той працы, якая з'яўлялася адной з крыніц выжывання і выратавання людзей на акупаванай тэрыторыі Беларусі. З прыведзеных матэрыялаў вынікае, што сучаснай беларускай гістарычнай навуцы патрэбен аналіз феномена прымусовай працы з улікам не толькі айчыннай, але і замежнай спецыяльнай літаратуры. Між тым, толькі цяпер становіцца асабліва відавочным, што прымусовая праца з'яўляецца адной з праблем ваеннай гісторыі Беларусі, пры вывучэнні якой назіраецца *збліжэнне* пазіцый даследчыкаў, у выніку шматгадовых дыскусій становіцца прыкметным пэўны навуковы кансенсус, чаго нельга пакуль сказаць у дачыненні да іншых пытанняў гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Да ліку новай тэматыкі, якая з'явілася ў беларускай ваенна-гістарычнай навуцы, адносіцца ***гісторыя ваеннай паўсядзённасці*** аб умовах жыцця насельніцтва падчас акупацыі тэрыторыі Беларусі. Яна прадстаўлена ў матэрыялах *В.В.Брыгадзінай* "Да пытання аб вывучэнні паўсядзённай гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", *М.Г.Жылінскага* "Сутнасць і змест акупацыйнай сістэмы адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", *Г.С.Хадасевіч* "Да пытання аб праваслаўнай царкве ў Беларусі ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі", *Л.С.Скрабінай* "Чалавек і вайна: настроі, паводзіны насельніцтва Беларусі ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі", "Штодзённасць у Беларусі пад акупацыяй 1941—1944 гг.", *І.Ю.Варанковай* "Нямецкая абшчына ў акупаваным Мінску ў 1942—1944 гг.", *І.І.Сацукевіча* "Нямецкія карты і планы Мінска як тапаграфічная крыніца па гісторыі горада ў 1941—1944 гг.", *А.Г.Цымбала* "Палітыка нямецкай акупацыйнай адміністрацыі і беларускай калабарацыі ў адносінах да Праваслаўнай Царквы (1941—1944)"; *В.М.Матоха* "Інваліды ў час нацысцкай акупацыі Беларусі 1941—1944 гг." (на аснове матэрыялаў Дзяржархіва Мінскай вобласці), *І.У.Нікалаевай* "Сацыяльныя мерапрыемствы акупацыйных улад у дачыненні да жанчын Беларусі 1941—1944 гг.", *У.І.Кузьменкі* "Сацыяльныя слаі і групы насельніцтва Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі 1941—1944 гг.", *С.А.Сіткевіча* і *Я.М.Цішчанкі* "Хворае насельніцтва Беларусі ў перыяд германскай акупацыі 1941—1944 гг.", *С.А.Сіткевіча* "Інфармацыйна-прапагандысцкая работа СВБ-АК у гады Другой сусветнай вайны", *В.Я.Бездзель* "Дзіцячыя дамы на Віцебшчыне ў час германскай акупацыі (1941—1944 гг.)", *Я.А.Грэбеня* "Судовая сістэма на акупаванай тэрыторыі Беларусі 1941—1944 гг.".

Разгляд новай тэматыкі, да якой пачалі звяртацца айчынныя гісторыкі, сведчыць аб тым, што беларуская ваенна-гістарычная навука не выпадае з агульнага рэчышча сусветнай гістарычнай навукі, у якой пытанні паўсядзённасці, праблемы жыцця звычайнага чалавека ва ўмовах вайны і акупацыі набываюць усё большае значэнне. Аўтары матэрыялаў не толькі ўдакладняюць шматлікія аспекты гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але ставяць новыя пытанні, без вырашэння якіх практычна нельга рухацца наперад у аб'ектыўным вывучэнні гісторыі германскай акупацыі Беларусі 1941—1944 гг. Патрабуюць асвятлення шматлікія старонкі жыцця мірнага беларускага насельніцтва, неабходны аналіз стратэгій выжывання той яго часткі, якая заставалася на акупаванай тэрыторыі і была вымушана рознымі сродкамі весці барацьбу за сваё жыццё, жыццё сваіх родных і блізкіх. Мэтазгодным нам бачыцца праца́ сістэмнага аналізу пытанняў гісторыі паўсядзённасці беларускага акупаванага грамадства, якое ва ўмовах жорсткіх выпрабаванняў і жахлівых наступстваў не згінула, а вытрымала выклікі вайны і акупацыі, смерці і жыцця.

Знайшлі сваё асвятленне ў матэрыялах зборнікаў ***пытанні нацысцкага генацыду*** на акупаванай тэрыторыі Беларусі, асабліва малавядомыя аспекты палітыкі вынішчэння, рабавання і эксплуатацыі мясцовага насельніцтва, ваеннапалонных, яўрэяў. Розныя азначэнні Халакосту вылучаны *Я.З.Басіным* у матэрыяле "Да пытання аб дэфініцыях Халакосту". "Палітыка генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. (па матэрыялах нацыянальнай калекцыі "Александрыйскіх мікрафільмаў")" разгледжана *С.П.Кубекам*. Аб маштабах Халакосту і яго асаблівасцях у Беларусі распавёў Э.Р.Іофе ў матэрыялах "Гэта быў Халакост", "Асаблівасці Халакосту на беларускай зямлі". Жудасная гісторыя пагромаў у Мінскім гета і яго ліквідацыі ў кастрычніку 1943 г. апісана *С.М.Тукалам* у артыкулах "Мінскае гета ў апошнія месяцы свайго існавання (чэрвень—кастрычнік 1943 г.)", "Канфіскацыя маёмасці яўрэяў Мінскага гета", "Праўдзенне пагромаў у Мінскім гета". Карную палітыку нацыстаў у адносінах да вязняў Віцебскага гета прааналізавала *А.І.Корсак* у паведамленнях "Акупацыйны рэжым і Віцебскае гета ў час Вялікай Айчыннай вайны", "Этапы карнай палітыкі нацыстаў у дачыненні да вязняў гета на тэрыторыі Віцебскай вобласці (1941—1943 гг.)". Гістарычныя факты аб трагічным лёсе вязняў Баранавіцкага гета апісаны *В.П.Гарматным* у матэрыяле "Баранавіцкае гета: трагедыя і гераізм".

З пераліку матэрыялаў бачна, што цэнтральнай праблемай вывучэння гэтага аспекту ваеннай гісторыі Беларусі застаюцца наступствы нацысцкага генацыду ў дачыненні да яўрэйскага насельніцтва. Гэтаму пытанню ў апошні час надаецца асаблівая ўвага, што вынікае з спецыфікі савецкага часу, калі гэта тэматыка доўгі час замоўчвалася. Заслугоўвае павагі той факт, што беларускія гісторыкі актыўна працуюць над выяўленнем спецыфікі генацыду яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Але пры гэтым становіцца ўсё больш відавочнай тэндэнцыя, калі практычна не даследуюцца наступствы нацысц-

кага генацыду мясцовага насельніцтва, маштабы злачынстваў у дачыненні да якога былі вельмі значнымі. Праблема людскіх страт павінна пастаянна знаходзіцца ў фокусе даследчыцкіх пошукаў і знаходак беларускіх гісторыкаў, у тым ліку ўдзельнікаў сустрэч у МДЛУ. Відавочна, што беларускім гісторыкам неабходна па-новаму глядзець на стэрэатыпныя ўяўленні аб гісторыі генацыду, а не толькі Халакосту на беларускай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Шэраг матэрыялаў змяшчае цікавыя факты аб ***гісторыі калабарацыянізму***, прычынах яго ўзнікнення, структуры і дзейнасці ў гады акупацыі Беларусі. Гэта паведамленні *А.М.Літвіна* аб Саюзе барацьбы супраць бальшавізму, *М.Г.Нікіціна* аб Саюзе беларускай моладзі і Беларускай народнай самапомачы, *І.А.Валахановіча* аб дзейнасці спецыяльнага батальёна "Дальвітц", *А.В.Бяляева* аб мясцовай дапаможнай адміністрацыі, *У.К.Коршука* аб Беларускай цэнтральнай радзе, беларускім нацыянальным адраджэнні, *К.І.Козака* аб палітычнай калабарацыі, *Ю.У.Зверава* аб "рускіх фарміраваннях" у структуры вермахта, *А.А.Кавалені* аб Саюзе беларускай моладзі, *У.І.Кузьменкі* аб Беларускім навуковым таварыстве.

У пералічаных матэрыялах аўтары пераканаўча паказваюць, што згаданая праблематыка займае пэўнае месца ў гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, хоць па зместу і выніках аўтарскіх напрацовак можна гаварыць аб яе вывучэнні не як тыповай, а штучнай з'явы беларускай ваеннай гісторыі. У гэтым плане адметным можна лічыць меркаванне А.А.Кавалені аб тым, што пакуль большая частка дакументальнага архіўнага матэрыялу застаецца незапатрабаванай даследчыкамі. Аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі таксама сведчыць аб некрытычным асэнсаванні навукоўцамі шэрагу крыніц, іх тэндэнцыйным падборы, падгонцы пад пэўны метадалагічна-ідэалагічны погляд. На самай справе гісторыя акупацыі не можа быць паказана як простае процістаянне дзвюх супрацьлеглых сіл, а павінна разглядацца як значна больш складаная, супярэчлівая і шматаспектная з'ява вайны на тэрыторыі Беларусі.

***Становішча Беларусі пасля вызвалення ад нацысцкіх захопнікаў*** таксама знаходзіцца ў цэнтры навуковага пошуку ўдзельнікаў канферэнцыі. Так, *А.У.Ціманава* раскрывае розныя аспекты адаптацыі людзей да ўмоў пасляваеннага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў матэрыялах "Сялянства Беларусі ў першыя месяцы пасля вызвалення (верасень 1943—май 1945 гг.): псіхалагічныя наступствы нацысцкай акупацыі", "Аб знаходжанні беларускіх сялян на прымусовых работах у рэйху (па матэрыялах рэгістрацыйных спісаў рэпатрыіраваных савецкіх грамадзян: студзень—май 1945 гг.)", "Аб напрамках дзейнасці наркамата юстыцыі на вызваленай тэрыторыі БССР (восень 1943—вясна 1944 гг.)". Характар мерапрыемстваў па прыёму рэпатрыянтаў даследаваны *А.В.Шарковым* у публікацыі "Мерапрыемствы па прыёму савецкіх грамадзян, якія па розных прычынах апынуліся на тэрыторыі дзяржаў Заходняй Еўропы (1944—1946)". Іншыя аспекты гэтай тэмы разгледжаны *В.В.Брыгадзінай* у матэрыяле "Беларусы ў лагерах "дзі-пі" (перамешчаных асоб) у Заходняй Германіі (1945—пачатак 1950-х гг.)".

Аб санітарных мерапрыемствах і пачатку аднаўлення аховы здароўя ў Беларусі расказалі *Я.М.Цішчанка* і *С.А.Сіткевіч* у матэрыяле "Хворае насельніцтва Беларусі ў перыяд акупацыі 1941—1944 гг.: ахвяры і асобныя факты міласэрнасці", "Санітарна-супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы ў Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе". *В.Г.Маскалёў* паспрабаваў разгледзець вынікі вайны ў матэрыяле "Да пытання аб стратах у Вялікай Айчыннай вайне", *М.А.Бандарэнка* ў матэрыяле "Рэпатрыяцыя нашых суайчыннікаў з Германіі пасля Перамогі" разгледзеў гэты эпізод ваеннай гісторыі.

Неабходна адзначыць, што новыя аспекты гісторыі пасляваеннай паўсядзённасці ўяўляюць значны навуковы інтарэс. Іх распрацоўка патрабуе пэўнага часу. Але ўжо цяпер можна гаварыць аб імкненні айчынных гісторыкаў пашырыць даследчыцкую тэматыку, паглыбіць веды і праводзіць сістэмнае вывучэнне гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. Відавочна, што агульная карціна ваенных і першых пасляваенных падзей, асабліва цяжкага лёсу беларускіх людзей, была больш складанай і супярэчлівай, чым гэта паказвалася ў гістарычных працах мінулых гадоў.

Хацелася б узгадаць тыя страты, якія панесла беларуская навука за гэтыя гады. Пайшлі з жыцця ўдзельнікі канферэнцыі, вядомыя гісторыкі прафесар У.І.Лемяшонак, дацэнты Э.А.Ліпецкі і В.І.Курганаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь М.А.Бандарэнка.

Каля двух дзясяткаў матэрыялаў, апублікаваных на старонках зборнікаў, належаць пяру ***гісторыкаў з ФРГ***. Першым нямецкім гісторыкам, які ўдзельнічаў ужо ў другой канферэнцыі ў маі 2003 г., з'яўляўся навуковы супрацоўнік Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме доктар гісторыі *Бернгард К'яры* — аўтар манаграфіі "Штодзённасць па-за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі 1941—1944 гг." і адказны рэдактар калектыўнай працы "Польская Армія Краёва: міфы і рэчаіснасць". Нямецкі гісторык апублікаваў у зборніках канферэнцыі наступныя матэрыялы: "Падыходы да гісторыі Другой сусветнай вайны ў Беларусі ў двух даследаваннях з Германіі", "Савецкія акупаваныя тэрыторыі, ці Разважанні аб нямецкім панаванні ў эпоху сусветных войнаў". Ён адзначыў, што сам факт абмеркавання пытанняў вайны на канферэнцыі "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" сведчыць пра тое, што гісторыя Другой сусветнай вайны з тэмы праціборства пераўтвараецца ў прадмет навуковага вывучэння.

У далейшым кантакты паміж вучонымі пашыраліся дзякуючы ўдзелу даследчыкаў з Інстытута сучаснай гісторыі ў Мюнхене *Петэра Ліба* і *Дытэра*

*Поля*. Першы ў матэрыяле "Злачынцы па перакананні? (Палкоўнік Карл фон Ардрыян і знішчэнне яўрэяў 707-й пяхотнай дывізіяй у 1941—1942 гг.)" на аснове дакументальных матэрыялаў раскрыў дзейнасць на тэрыторыі Беларусі адной з нямецкіх пяхотных дывізій па вынішчэнню яўрэяў, другі ў артыкуле "Даследаванне поўнага вынішчэння: вынікі і перспектывы" паказаў маштабы Халакосту ў гады германскай акупацыі Беларусі. *Крысціна Ботцэт*, даследчыца з Фрайбургскага ўніверсітэта, у матэрыяле "Арганізацыя ТОДТ у Беларусі" раскрыла структуру і паказала характар дзейнасці нямецкай будаўнічай арганізацыі ў Беларусі.

Аналіз матэрыялаў замежных гісторыкаў паказвае, што нямецкія аўтары імкнуцца да звужэння поля свайго навуковага пошуку, надаюць асаблівую ўвагу паглыбленню асобных аспектаў ваеннай гісторыі, дэталізуюць кожную канкрэтную падзею і спрабуюць шматбакова паказаць яе з выкарыстаннем шматузроўневых гістарычных ведаў. Паказ любых дэталей у комплексе агульных падзей з выяўленнем іх месца ў агульнай карціне гісторыі акупацыі Беларусі — важны метадалагічны ключ для далейшага вывучэння айчыннымі даследчыкамі гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На нашу думку, у гэтым плане больш глыбокага асвятлення патрабуе дзейнасць розных нацысцкіх службаў, устаноў і арганізацый, пра што сведчыць комплекс існуючых у беларускіх архівах арыгінальных дакументаў. Патрабуецца пошук гістарычнай рэчаіснасці з улікам гэтай базы дакументальных фактаў.

Дактарант Майнцкага ўніверсітэта *Аляксандр Бракель* прымаў удзел у канферэнцыях на працягу некалькіх гадоў. Ён прадстаўляў вынікі параўнальнага даследавання гісторыі аднаго з рэгіёнаў Заходняй Беларусі — Баранавіцкай вобласці і акругі Баранавічы ў 1939—1944 гг. у матэрыялах "Да пытання аб гістарыяграфіі "партызанскай вайны" ў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны", "Дакументы партызанскага руху і Халакост", "Да пытання так званага "яўрэйскага калабарацыянізму" ў польскіх усходніх абласцях у 1939—1941 гг. (на прыкладзе Баранавіцкай вобласці)", "Міжнацыянальныя канфлікты як наступства нацыянальнай палітыкі савецкай і нямецкай улад (1939—1944 гг.)", "Адносіны неяўрэйскага насельніцтва да яўрэяў у час Халакосту ў акрузе Баранавічы". У 2006 г. ва ўніверсітэце імя Гутэнберга ў Майнцы адбылася паспяховая абарона яго дысертацыі, якая ў 2009 г. выйшла асобнай кнігай "Пад Чырвонай зоркай і свастыкай: Баранавічы 1939—1944 гг. Заходняя Беларусь пад савецкай і нямецкай уладамі".

У параўнальным кірунку адбываецца і даследаванне гісторыі лагера смерці Трасцянец. У якасці асноўнай праблемы вылучана колькасць ахвяр, знішчаных рознымі нацысцкімі службамі на працягу існавання працоўнага лагера і лагера смерці Малы Трасцянец. З 2005 г. гэтыя матэрыялы друкуе *Петра Рэнтрап* — дактарант Цэнтра па даследаванні антысемітызму пры тэхнічным універсітэце Берліна:




*Зборнік навуковых артыкулаў "Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944 гг.)".*

"Малы Трасцянец як гаспадарка камандзіра ахоўнай паліцыі і СД і як лагер смерці", "У цені смерці: стратэгіі выжывання зняволеных Мінскага гета", "Да становішча ў акупаваным Мінску дэпартаваных з Цэнтральнай Еўропы яўрэяў". П.Рэнтрап даследуе гісторыю Мінскага гета, працоўнага лагера і лагера смерці Малы Трасцянец, на прыкладзе якіх прасочваецца трагічны лёс як мясцовых яўрэяў, так і яўрэяў з еўрапейскіх краін. Пры гэтым яна нагадвае, што гісторыя лагера смерці Малы Трасцянец пакуль застаецца да канца дакументальна нерэканструяванай, робіць спробу ўбачыць асноўныя вехі трагедыі вязняў лагера на аснове значнай базы крыніц з розных архіваў Беларусі, Германіі, Ізраіля, ЗША, Латвіі. Вынікі, да якіх прыйшла нямецкая даследчыца, ставяць перад беларускай гістарычнай навукай новыя пытанні па аб'ектыўным вывучэнні гэтай пакуль заблытанай праблематыкі.

Даследаваннем гісторыі дэпартацыі аўстрыйскіх яўрэяў у Мінск і Малы Трасцянец у 1941—1942 гг. займаўся дактарант Венскага ўніверсітэта *Роберт Мархль*, які на аснове дакументаў з беларускіх і нямецкіх архіваў прадставіў у сваім матэрыяле вынікі "Мінскага праекта", сутнасць якога заключалася ў навуковай рэканструкцыі гісторыі Мінскага гета і лагера смерці ў Трасцянцы з мэтай вывучэння гісторыі амаль 10 тыс. дэпартаваных у Мінск аўстрыйскіх яўрэяў.

Аб рэгістрацыі жыхароў у Гродна і акрузе Гродна ў час іх уваходжання ў склад акругі Беласток расказана ў матэрыяле даследчыка з Фракфурта-на-Одры *Фелікса Акермана* "Ідэнтычнасць па пашпарце: увядзенне афіцыйных пасведчанняў асобы". У ім разгледжаны пытанні перадваеннай і ваеннай пашпартызацыі мясцовага насельніцтва.

Самая значная колькасць нямецкіх навукоўцаў прысутнічала на 9-й навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія" ў 2010 г., калі ў рамках выканання беларуска-германскага праекта "Вопыт прымусо-

вай працы беларускіх грамадзян у гады Другой сусветнай вайны", падтрыманага фондам "Памяць, адказнасць, будучыня" (ФРГ), для ўдзелу ў навуковай дыскусіі па праблеме прымусовай працы былі запрошаны вядучыя нямецкія спецыялісты — дактары гісторыі *Таня Пентэр*, *Аляксандр Бракель* і *Дытэр Поль*. Яны прадставілі наступныя матэрыялы: "Ахвяры дзвюх дыктатур: прымусовая праца ў Данбасе пры Гітлеру і Сталіне" (Т.Пентэр), "Прымусовая праца мясцовага насельніцтва на апарат германскіх акупацыйных улад (на прыкладзе Баранавіцкай акругі)" (А.Бракель), "Прымусовая праца ў акупаванай Усходняй Еўропе — стан нямецкай гістарыяграфіі" (Д.Поль). Аналізуючы сучасны стан нямецкай гістарыяграфіі па вывучэнню прымусовай працы на акупаванай тэрыторыі Усходняй Еўропы, Д.Поль яшчэ раз звярнуў увагу на тое, што ваенна-гістарычная навука не можа развівацца выключна ў нацыянальным кантэксце. Гэты факт пацвярджае і выданне пры ўдзеле трох нямецкіх і трох беларускіх гісторыкаў асобнага зборніка навуковых артыкулаў "Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944 гг.)" (Мн., 2010). Менавіта выкарыстанне шырокай дакументальнай базы, у тым ліку замежных архіўных фондаў, заклала аснову для выканання беларускімі гісторыкамі А.М.Літвіным, Я.А.Грэбенем і С.Я.Новікавым навуковага праекта, вынікі якога адлюстраваны ў даследаванні "Вяртанне ў рабства. Прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941—1945 гг." (Мн., 2010). Прэзентацыя гэтых прац адбылася на другім пленарным пасяджэнні 10-й канферэнцыі ў красавіку 2011 г.

Акрамя нямецкіх гісторыкаў у абмеркаванні пытанняў беларускай ваеннай гісторыі пастаянна ўдзельнічае польскі гісторык беларускага паходжання *Ю.В.Грыбоўскі*, які падрыхтаваў матэрыялы "Антынямецкія выступленні сярод беларускіх жаўнераў 30-й грэнадзёрскай дывізіі СС", "Беларусы сярод нямецкіх ваеннапалонных на службе ў 2-м польскім корпусе (1944—1945 гг.)", "Стварэнне і дзейнасць партыі беларускіх нацыяналістаў на тэрыторыі Трэцяга рэйха, або да пытання пра існаванне беларускага нацыянальнага падполля падчас Другой сусветнай вайны". У 9-й канферэнцыі прыняла ўдзел дактарантка Варшаўскага ўніверсітэта *Мажэна Ялоза*, якая прадставіла даследаванне "Ліга беларускіх палітычных вязняў нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў: да гісторыі існавання малавядомай беларускай арганізацыі ў Заходняй Нямеччыне ў пасляваенныя гады".

Значнае месца ў зборніках канферэнцый займаюць матэрыялы іншых замежных навукоўцаў, якія даследуюць шырокі спектр гістарычнай праблематыкі, у тым ліку ваеннай. Актыўны ўдзел у канферэнцыі на працягу некалькіх гадоў бяруць гісторыкі Літвы — *А.Бубніс* (Вільнюс); Латвіі — *Э.Екабсон*, *К.Зэліс*, *У.Нейбургс* (Рыга) і *З.Аляхновіч* (Даўгаўпілс). Сталымі ўдзельнікамі форума ў МДЛУ з'яўляюцца і расійскія гісторыкі, у тым ліку: *У.Г.Буркоў*, *Ю.З.Кантор*, *І.М.Новікава* (Санкт-Пецярбург), *А.А.Ржашэўскі*, *М.Ю.Мягкоў*, *Ю.А.Нікіфараў* (Масква), маладыя даследчыкі *З.В.Суржык* і *У.В.Фядзюнін* (Масква); а таксама *С.У.Крэцінін* (Варонеж), *В.Л.Чарнапёраў* (Іванава); *А.Э.Церахаў* (Кемерава). Не абмінаюць увагай канферэнцыю і ўкраінскія гісторыкі (*А.В.Патыльчак*).

Важнай адметнасцю канферэнцый "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" можна лічыць і факт актыўнага ўдзелу ў ёй аспірантаў, саіскальнікаў, дактарантаў, у тым ліку замежных, хто даследуе праблемы ваеннага беларусазнаўства. Многія з іх і пасля абароны сваіх дысертацыйных даследаванняў падтрымліваюць навуковыя кантакты ў рамках штогадовых сустрэч у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

У заключэнне хацелася б нагадаць, што ў дадзеным артыкуле прадстаўлены агляд матэрыялаў толькі ваеннай праблематыкі, у той час як значная частка апублікаваных матэрыялаў у зборніках дзевяці канферэнцый закранае самыя розныя аспекты гістарычнага мінулага і сучаснага развіцця Беларусі і Германіі. Спадзяёмся, што канферэнцыя "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" дазволіць і надалей умацоўваць стасункі айчынных і замежных гісторыкаў і ўсіх тых, хто ў XXI ст. застаецца нераўнадушным да гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

**Літаратура**

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 23 мая 2002 г. / Гал. рэд. У.Ф.Ладысеў. Мн., 2002.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 16 мая 2003 г. / Гал. рэд. А.А.Каваленя. Мн., 2003.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22 красавіка 2004 г. / Гал. рэд. А.А.Каваленя, С.Я.Новікаў. Мн., 2004.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 13 мая 2005 г. / рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. гал. рэд.) [і др.]. Мн., 2005.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 12 мая 2006 г. / рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. Мн., 2007.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 26 красавіка 2007 г. / рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. Вып. 6. Мн., 2007.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 25 красавіка 2008 г. / рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. Вып. 7: у 2 кн. Мн., 2009.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 17 красавіка 2009 г. / рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. Вып. 8. Мн., 2010.

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 8 красавіка 2010 г. / рэдкал.: А.А.Каваленя (гал. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. Вып. 9. Мн., 2010.